**В. Г. Мазец**

# НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ ФІНАНСАВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ЎРАДА БНР У 1918 г.

21 лютага 1918 г. Выканаўчы Камітэт Савета І Усебеларускага з'езда выдаў Першую Устаўную Грамату і абвясціў сябе часовай уладай на Беларусі. Быў створаны Народны Сакратарыят Беларусі, які ўзначаліў Язэп Варонка. Пасаду народнага сакратара фінансаў заняў Гелій Белкінд [1]. Пастановай № 1 Народны Сакратарыят Беларусі 21 лютага 1918 г. абвясціў усю казённую маёмасць, установы, капіталы і каштоўнасці здабыткам беларускага народа [2, с. 208].

Разам з тым працэс станаўлення беларускай дзяржаўнасці адбываўся ў надзвычай неспрыяльных абставінах. Нягледзячы на ўстанаўленне ў Мінску па ініцыятыве палякаў злучанай польска-беларускай камендатуры, палякамі было абрабавана палявое казначэйства 38 і 2 Каўказскага корпуса і Мінская Паштова-Тэлеграфная кантора на 15 млн. руб. і розных каштоўнасцей [3, с. 54].

22 лютага ў Мінск па чыгунцы прыбыў першы вайсковы аддзел немцаў, а 25 лютага нямецкі камендант высяліў Народны Сакратарыят з яго Дома і канфіскаваў касу – 341 441 руб. Пасля некалькіх зваротаў з просьбай вярнуць грошы 12 сакавіка 1918 г. прадстаўнікам Народнага Сакратарыята было заяўлена аб тым, што для разгляду пытання аб прыналежнасці грошай, «секвестраваных ва ўстановах г. Мінска, германскімі акупацыйнымі ўладамі была створана асобая камісія» [2, с. 54]. Народны Сакратарыят накіраваў двух сваіх прадстаўнікоў для ўдзелу ў рабоце гэтай Камісіі: Гелія Белкінда і Пятра Крэчэўскага. Але нават стварэнне асобай камісіі не мела станоўчага выніку ў справе вяртання грошай. Пра гэта сведчыць ліст Народнага Сакратарыята БНР, накіраваны 1 ліпеня 1918 г. обер-кватэрмайстру Штаба X Арміі, у якім у чарговы раз перад акупацыйнымі ўладамі было ўзнята пытанне вяртання канфіскаваных у лютым 1918 г. грошай [2, с. 57]. Як сведчыць ліст Народнага Сакратарыята фінансаў БНР Мінскаму казначэйству ад 31 кастрычніка, канфіскаваныя германскім камендантам грошы так і не былі вернутыя [2, с. 289].

Такім чынам, пасля канфіскацыі германскім камендантам ў лютым 1918 г. грашовых сродкаў Народнага Сакратарыята фінансавае пытанне паўстала асабліва востра. «Ноль фінансавага становішча Рады і Сакратарыяту павялічыўся толькі тым», што 18 сакавіка Мінская гарадская дума прыняла рашэнне асігнаваць у распараджэнне Народнага Сакратарыята 10 тыс. руб. [4, с. 30]. 29 сакавіка скарбніку Народнага Сакратарыята Васілю Захарку даручылі атрымаць грошы, асігнаваныя Мінскай гарадзкой думай [2, с. 65]. Разам з тым у касу Народнага Сакратарыята патрапіла толькі частка грошай у памеры 4 тыс. 500 руб. [2, с. 115].

На пасяджэнні Народнага Сакратарыята 24 сакавіка 1918 г. разглядалася справа пасылання дэлегацыі ў Кіеў з просьбамі аб грашовай пазыцы для Беларускай Народнай Рэспублікі. Гэта па сутнасці і з'явілася падставай, каб узняць пытанне аб неабходнасці абвяшчэння незалежнасці БНР. Згодна з пастановаю Народнага Сакратарыята ад 23 красавіка 1918 г. сябры Рады Беларускай Народнай Рэспублікі Аляксандр Цвікевіч і Сымон Рак-Міхайлоўскі былі ўпаўнаважаны Народным Сакратарыятам на заключэнне грашовай пазыкі да пяцідзесяці мільёнаў рубл. ад Урада Украінскай Народнай Рэспублікі і на атрыманне гэтых грошай [2, с. 128].

Акрамя таго, 26 сакавіка Народны Сакратарыят БНР звярнуўся да нямецкага каменданта з просьбай дазволіць беларускім культурным арганізацыям скарбонкавы збор на вуліцах і ва ўстановах Мінска [2, с. 65].

29 сакавіка 1918 г. на паседжанні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі былі створаныя 6 камісій, у тым ліку і фінансавая [2, с. 67].

У красавіку 1918 г. на разгляд Рады БНР Язэп Варонка і Пётр Крэчэўскі паставілі пытанне аб выпуску беларускіх крэдытных білетаў, якія забяспечваюцца коштам таварнага лесу [5].

Пётр Крэчэўскі (народны сакратар фінансаў БНР) у маі 1918 г. склаў праграму развіцця фінансаў і гандлю. Згодна з праграмай прадугледжваліся наступныя мерапрыемствы:

«1) знешнія займы, як аснова прызнання Рэспублікі і моцнага становішча ўласнай валюты;

2) выпуск уласных грошай, якія забяспечваюцца "драўлянай валютай" (коштам таварнага лесу):

а) асноўным фондам, які забяспечвае валюту, з'яўляюцца казённыя лясы памерам 1 мільён дзесяцін на суму па даваенным сярэднім кошце 5 мільярдаў рублёў;

б) у адпаведнасці з законам БНР, што лясы з'яўляюцца дзяржаўнай уласнасцю, у распараджэнне дзяржавы перадаваліся і лясы, што знаходзіліся ў прыватнай уласнасці, што складае фонд памерам 6 мільёнаў дзесяцін на суму 30 мільярдаў рублёў.

3) выпуск латарэйных білетаў на ўзор Варшаўскай латарэі» [6, арк. 120].

На паседжанні Рады БНР 1 мая 1918 г. было прынята рашэнне стварыць фінансавую камісію, у склад якой былі выбраны Пётр Крэчэўскі, Васіль Захарка, Фёдар Вернікоўскі, Канстанцін Цвірка-Гадыцкі і Мікола Пашковіч. Старшынёй Народнага Сакратарыята БНР Язэпам Варонкам у канцы мая

1918 г. была заснавана Фінансавая камісія, якая займалася разглядам дакладаў, што паступалі на імя Старшыні, і падрыхтоўкай новых законапраектаў. У гэтую камісію быў запрошаны цэлы шэраг вядомых банкаўскіх дзеячаў, а таксама былы народны сакратар фінансаў БНР Гелій Белкінд [7, арк. 211].

Народным Сакратарыятам былі зроблены захады па стварэнні краёвага банка. Так, Эдвард Будзька атрымаў 28 мая 1918 г. ад Народнага Сакратарыята даручэнне правесці перагаворы з «Мінскім Саюзам Кааператываў» аб стварэнні «краёвага беларускага кааператыву і такога самага грашовага банку» [2, с. 163].

Фінансавае становішча ўрадавых структур БНР істотна палепшылася ў пачатку мая 1918 г. На паседжанні дэлегацыі Народнага Сакратарыята БНР быў заслуханы даклад Аляксандра Цвікевіча аб атрыманні 300 тыс. руб. у рахунак авансу за прададзеныя дровы [2, с. 148]. З пералічанай 15 мая сумы было атрымана 50 тыс. руб., з якіх 25 тыс. руб. было накіравана Народнаму Сакратарыяту, 10 тыс. руб. выдадзена пад распіску Старшыні Беларускай Гандлёвай Палаты ў Кіеве паводле сметы, зацверджанай Народным Сакратарыятам, і 15 тыс. руб. – пакінута ў распараджэнні дэлегацыі для вядзення перагавораў і выдання газет і брашур [2, с. 152].

Усяго на працягу 30 красавіка – 1 ліпеня 1918 г. у касу Народнага Сакратарыята паступіла 132 тыс. 899 руб. 51 кап. Большую частку даходу – 125 тыс. руб. – склалі грашовыя сродкі ад УНР за прададзеныя дровы [2, с. 152]. Акрамя таго, касу папоўнілі грошы, атрыманыя ад Гарадской управы і скарбонкавых збораў.

Амаль палова паступіўшых на рахунак Народнага Сакратарыята сродкаў – 62 тыс. 666 руб. 37 кап. былі выдаткаваны на зарплату членам Рады БНР. Даволі значную частку атрыманых сродкаў агульным памерам 45 тыс. 150 руб. Народны Сакратарыят накіраваў на культурна-асветніцкія патрэбы [2, с. 196–197]. Так, 22 мая 1918 г. Народны Сакратарыят прыняў пастанову, якой былі вызначаны выдаткі на выдавецкую дзейнасць. У адпаведнасці з пастановай прадугледжвалася:

«– выдаць Віленскаму выдавецтву Вацлава Ластоўскага тры тысячы рубл. на друк і выданне вучэбнікаў;

– выдаць аванс Народнаму Сакратару Прасветы А. Смолічу тры тысячы рубл. на выпуск вершаў «Матчын Дар» Алеся Гаруна;

– выдаць субсідыю рэдакцыі газэты «Вольная Беларусь» на выданне літаратурнай хрэстаматыі ў памеры двух тысяч пяцьсот рубл.;

– на выданне праваслаўнаго малітвенніка і дзіцячай чытанкі выдаць пяцьсот рубл.;

– выдаць субсідыю рэдакцыі газэты «Вольная Беларусь» дзве тысячы рубл.;

– асігнаваць на выданне штодзённай беларускай газэты у Мінску дзве тысячы рубл.;

– дапамагчы выданню віленскай газэты «Гоман» у памеры двух тысячаў рублёў» [2, с. 161].

Акрамя таго, на будаўніцтва Будслаўскай гімназіі ў адпаведнасці з пастановай Народнага Сакратарыята ад 27 мая было выдаткавана 13 тыс. 500 руб., на набыццё паперы для друкавання падручнікаў па пастанове ад 17 чэрвеня – 6 тыс. 500 руб., Беларускай кансерваторыі паводле пастановы ад 20 чэрвеня – 5 тыс. 300 руб. [2, с. 196–197].

На працягу 1 ліпеня – 1 верасня 1918 г. у касу Народнага Сакратарыята паступілі 62 тыс. 374 руб. Большая частка грошай у памеры 56 тыс. руб. была атрымана скарбнікам Народнага Сакратарыята Васілём Захаркам ад кіраўніка Беларускай гандлёвай палаты ў Кіеве Мітрафана Доўнар-Запольскага і члена дэлегацыі Народнага Сакратарыята БНР у справах перагавораў на Ўкраіне Паўла Трэмповіча.

У адрозненне ад папярэдняга перыяду невялікая сума грошай, якая засталася пасля выплаты зарплаты ў памеры 54 тыс. 578 руб. членам Рады БНР, народным сакратарам і служачым Сакратарыята, была выдаткавана не на культурна-асветніцкія патрэбы. Так, 2 тыс. руб. атрымаў на арганізацыйныя расходы ўпаўнаважаны Беларускага консульства ў Адэсе; 1 тыс. руб. была выдадзена старшыні Камісіі па справах бежанцаў у Оршы Навуму Козічу. Акрамя таго субсідыю ў памеры 1 тыс. 300 руб. на патрэбы дзіцячай працоўнай калоніі атрымала Маліноўская, а 1 тыс. руб. для дзіцячага прытулку Мінска выдалі Фёдару Вернікоўскаму [2, с. 244–245].

Адным з пунктаў Дэкларацыі, абвешчанай ў ліпені 1918 г. Беларускім урадам на чале з Раманам Скірмунтам, быў выпуск уласных грошай – як толькі будзе прызнана дзяржаўнасць [8, арк. 77].

27 ліпеня 1918 г. эканамічная камісія Рады БНР на сваім паседжанні пастанавіла прасіць Народны Сакратарыят прыняць самыя энергічныя меры па вяртанні ўсіх банкаўскіх установаў, якія ў свой час былі эвакуіраваны з Беларусі, а таксама прыняць меры для адкрыцця ў Мінску ўсіх камерцыйных банкаў і заснавання Беларускага Народнага Банка. Дарэчы, асобныя палажэнні праграмы развіцця фінансаў і гандлю, прапанаваныя Пятром Крэчэўскім, пачалі знаходзіць практычнае прымяненне. Так, 5 лістапада 1918 г. Народны Сакратарыят прыняў пастанову аб выпуску Урадавай Беларускай латарэі [2, с. 291].

У верасні 1918 г. урад БНР у чарговы раз апынуўся ў складаным фінансавым становішчы.

У сувязі з гэтым 29 верасня Народны Сакратарыят звярнуўся да Беларускай гандлёвай палаты на Украіне з хадайніцтвам выдаць крэдыт да 5 тыс. руб. на імя старшыні Надзвычайнай дэлегацыі Рады БНР Антона Луцкевіча. Пытанне гэта было паспяхова вырашана 1 кастрычніка 1918 г. Антон Луцкевіч паведамляў сакратару замежных спраў БНР Янку Серадзе аб тым, што «“таварыства “Снабженіе” у Кіеве выказала сваю згоду» выдаць на рахунак Народнага Сакратарыята 15 тыс. руб. [2, с. 267].

Паступова фінансавыя цяжкасці былі пераадоленыя. На паседжанні Рады БНР, якое адбылося 20 лістапада 1918 г., разглядалася пытанне аб стварэнні камісіі дапамогі ваенна-палонным. Асобаўпаўнаважаны член Рады К. Савіч паведаміў, што ў распараджэнні камісіі было каля 100 тыс. руб. [2, с. 305].

Такім чынам, аналіз фінансавай дзейнасці ўрадавых структур БНР на працягу 1918 г. дае падставы зрабіць наступныя высновы. Па-першае, была распрацавана і часткова ажыццяўлялася, наколькі гэта было магчыма ва ўмовах акупацыі, праграма развіцця фінансаў і гандлю. Па-другое, грашовыя сродкі, неабходныя для функцыянавання ўрадавых структур БНР, паступалі пераважна ад урада Украінскай Народнай Рэспублікі. Па-трэцяе, грошы з касы Народнага Сакратарыята, акрамя зарплаты дзяржаўным служачым, выдаткоўваліся на культурна-асветніцкія і дабрачынныя мэты.

ЛІТАРАТУРА

1. Белорусская земля. – 1918. – 1 марта.
2. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. Ф. № 582 «Дзяржаўны Архіў Літвы. Рада Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі» / уклад., уступ. артыкул, камэнтары, паказальнікі С. Шупы. – Вільня ; Нью-Ёрк ; Менск ; Прага, 1998. – 982 с.
3. Замежная Беларусь : зборнік гісторыі, культуры і эканомікі (пад рэдакцыяй П. А. Крэчэўскага). – Кн. 1. – Прага : Выд-ва імя Ф. Скарыны, 1926. – 164 с.
4. *Краўцоў, М.* Рада Беларускай Народнай Рэспублікі / М. Краўцоў. – Вільня, 1921. – 78 с.
5. Минская газета. – 1918. – 19 апр.
6. НАРБ. – Фонд 325-п. – Воп. 1. – Спр. 8.
7. НАРБ. – Фонд 325-п. – Воп. 1. – Спр. 19.
8. НАРБ. – Фонд 325. – Воп. 1. – Спр. 10.